**Праваслаўнае духавенства Беларусі ў другой палове XIXст.: сацыяльна-дэмаграфічны агляд.**

**Карповіч Н.В.**

Праваслаўнае духавенства займае значнае месца ў шматграннай канфесійнай гісторыі Беларусі. Функцыі святара ў грамадстве могуць быць запатрабаваны ў розных галінах. Царквае мае багаты вопыт, які можна выкарыстаць пры ажыццяўленні сацыяльнай палітыкі.У сувязі з гэтым значную навуковую каштоўнасць уяўляе сабой гісторыя духоўнага саслоўя: яго фарміраванне, эвалюцыя, месца і роля ў сацыяльнай структуры грамадства. З мэтай узняць аўтарытэт праваслаўнага духавенства царскі ўрад у другой палове XIXст. выдаў шэраг законапалажэнняў, якія павінны былі аказаць уплыў на колькасныя і якасныя характарыстыкі духавенства, дакладна вызначыць яго склад, палепшыць стандарты царкоўнай службы. Працэс фарміравання праваслаўнага духавенства Беларусі адбываўся пад уздзеяннем агульнадзяржаўных пастаноў, але яму былі ўласцівы свае спецыфічныя рысы.

Асобныя аспекты сацыяльнага становішча духавенства былі прадстаўлены ў працах, якія дазваляюць прааналізаваць агульную структуру праваслаўнага духавенства Расійскай імперыі, не ўтрымліваючы дадзеных для Беларусі. Сучаснымі даследчыкамі распрацоўваецца шэраг пытанняў, звязаных з гісторыяй царквы і духавенства, дазваляючых выйсці на новый узровень аналізу, прапанаваць абагульняючы погляд на праблематыку.

Дынаміка колькасці праваслаўнага духавенства Беларусі рэгулявалася дзяржаўнай палітыкай, а таксама натуральным прыростам насельніцтва. Паводле дадзенных Цэнтральнага статыстычнага камітэта (ЦСК) ў 1858г. агульная колькасць праваслаўнага і адзінаверчаскага духавенства беларускіх губерняў складала 23099 чалавек [12,с.268-269]. А ў 90-х гг. XIXст. па падліках ўсеагульнага перапісу 1897г. было зафіксавана разам з членамі сямей 18721 прадстаўнікоў духавенства [3-7]. Такая тэндэнцыя была наступствам загадаў 1869 і 1885гг. Першы з іх скарачаў колькасць прычтаў, другі – дазваляў епархіяльным архіерэям іх аднаўляць. У выніку колькасныя змены ў складзе асобных груп духавенства паўплывалі на яго агульную колькасць.

Дадзеныя перапісу насельніцтва 1897г. дазваляюць вызначыць этнічную прыналежнасць духоўнага саслоўя на падставе звестак пра яго родную мову. Згодна ім, большасць духавенства складалі рускія – 53,8%, працэнт беларусаў – 44,3% [3-7].

Асноўная колькасць духавенства выконвала службу ва ўзросце ад 20 да 59 гадоў – 76, 5%. Працягвалі свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі займаць пасады і ў больш сталым узросце (з 60-гадовага ўзросту і старэйшыя складалі 18, 7% [3-7].

Кар’ера духавенства ў другой палове XIX ст. галоўным чынам залежыла ад ўзроўню адукацыі. У выніку ў канцы XIXст. удзельная вага адукаваных сярод свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў па падліках А.Г. Кахановскага складала звыш 90%.

Згодна Расійскаму закандаўству і кананічнаму праву праваслаўнае духавенства падзялялася на белае і чорнае (манаства). Сярод манаства іерархія выглядала наступным чынам: архіерэі - мітрапаліт, архіепіскап, епіскап, ў манастырах - архімандрыт, ігумен (ігуменні), іераманах, манах (манахіні), іерадыякан, паслушнік (паслушніцы). Да белага духавенства належылі: пратаіерэі, іерэі (святары), протадыяканы, дыяканы, царкоўныя прычэтнікі ў званні псаломшчыкаў [11,ст. 406.].

На фарміраванне складу белага духавенства значны ўплыў аказалі рэформы 60-70-х гг. XIXст. Прыналежнасць да праваслаўнага духавенства звязвалася з абавязковым служэннем ў Духоўным ведамстве. Загадам урада ад 16 красавіка 1869 г. быў дакладна вызначаны склад духавенства. Да духоўных асоб належылі свяшчэннаслужыцелі і царкоўнаслужыцелі, дакладна прычэтнікі, якія складаліся з дзячкоў, панамароў і псаломшчыкаў. Іншая частка царкоўнаслужыцеляў: званары, пеўчыя, старажы пры цэрквах, духоўна-навучальных установах і кансісторыях і іншыя, як асобы наёмныя не звязаныя з хіратэсіяй, былі выключаны з духоўнага звання [8, №46974].

Прыхадское духавенства складала асноўную масу белага духавенства. Прычт (прыхадское духавенства) складаўся з трох асноўных груп – святароў, дыяканаў і прычэтнікаў. Суадносіны паміж імі вызначаліся духоўнымі штатамі. На працягу другой паловы XIXст. адбываліся якасныя змены у складзе духавенства. Паколькі ў канцы 90-х гг. колькасць царкоўнаслужыцеляў паніжалася ў адносінах да свяшчэннаслужыцеляў, што садзейнічала аднароднасці саслоўя.

У адрозненні ад белага духавенства, толькі прадстаўнікі чорнага духавенства прызначаліся на вышэйшыя пасады. Асобы белага духавенства ў царкоўнай іерархіі не маглі быць вышэй пратаіерэя, а па службовай лесвіцы прадвінуцца не вышэй за благачыннага. Такім чынам, вышэйшых пасад ў праваслаўнай царкве можна было дасягнуць праз манаскі пострыг, але для яго прыняцця існавала шэраг умоў. Паводле расійскага заканадаўства мужчыны павінны былі мець не меньш 30 гадоў, жанчыны - 40. Асобы, якія скончылі курс багаслоўскіх навук і рыхтаваліся да настаўніцкай дзейнасці, атрымалі права з 25 гадоў. Для ўдовых святароў і дыяканаў – увогуле не меў значэння ўзрост [10, с. 12].

Акрамя таго, пастулаючы ў манастыр вызваляўся ад абавязкаў, якія не адпавядалі манаскім канонам. Будучы манах не павінен быў мець супруга альбо супругу, малалетніх дзяцей, неаплачаных даўгоў і не знаходзіцца пад судом [11, ст. 413]. Кожны паслушнік альбо паслушніца праходзілі трохгадовы тэрмін падрыхтоўкі да манаскага пострыга - так

званы “іскус паслушэнства”. Выключэнне было для асоб, скончыўшых курс семінарыі, а таксама для святароў і дыяканаў.

Акрамя вышэй адзачанага, ўлічвалася саслоўная прыналежнасць будучых кандыдатаў манаства. Некаторыя перашкоды былі для асоб былых падатных саслоўяў. Як вынік значную большасць сярод манаства і паслушнікаў ў 60-70-х гг. складалі выхадцы з духоўнага звання. На працягу разлядаемага часу ў асяроддзі чорнага духавенства паступова павялічвалася колькасць прадстаўнікоў з іншых сацыяльных груп. Ас абліва гэта тэндэнцыя прасочваецца пасля афіцыйнага распараджэння ў 1866 г. з боку ўладаў на дазвол адкрываць благачынныя і выхаваўчыя ўстановы ў манастырах [9, с.118 прым], што ў далейшым садзейнічала абнаўленню складу манаства і павелічэнню яго колькасці.

Для белага духавенства існавалі асноўныя крытэрыі пры заняцці адпаведнай царкоўнай пасады. Па-першае, заканадаўствам уводзіўся прынцып паступовасці, свайго роду прадвіжэнне па службовай лесвіцы, абавязкова ад ніжэйшых пасад да вышэйшых. Так, на месца псаломшчыкаў дазвалялася браць скончыўшых курс семінарыі альбо з такой жа адукацыяй, але папрацаваўшых не менш тры гады настаўнікамі ў пачатковых школах. На пасады памошнікаў настаяцеля прызначаліся толькі праслужыўшыя некаторы час у званні псаломшчыкаў альбо дыяканаў. Настаяцелямі палагалася прызначаць з ліку малодшых свяшчэннікаў [8,№46974]. Такім чынам, паляпшаючы ўзровень царкоўнаслужыцеляў (прычэтнікаў) рэфарматары спадзяваліся павысіць стандарты царкоўнай службы. У ідэале службовая рэформа павінна была запоўніць прабел паміж свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелямі, трансфарміруючы іх з палажэння асобных сацыяльных груп у два ўзроўні адной і той жа іерархіі. Што павышала бы статус і мабільнасць духавенства.

Духоўная адукацыя была важнейшым фактарам пры атрыманні царкоўнай пасады. Улады з мэтай узняць статус прыхадскога духавенства пастанавілі прымаць і на пасаду прычэтнікаў выхаванцаў семінарый альбо скончышшых. Так, у Магілёўскай епархіі ў 1897г. у параўнанні з 60-70-мі гг. колькасць скончыўшых семінарыі сярод прычэтнікаў павялічалася на 50% [1, с.353].

Другой ўмовай, неабходнай пры назначэнні на службовае месца з’яўляяўся ўзрост прэтындэнта. Законапалажэнне 16 красавіка 1869 г ўнесла некаторыя карэктывы, заснованыя на нормах кананічнага права, ў вызначэнні ўзроставага цэнзу для свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў. Так, у сан дыякана, на вакансію псаломшчыка дазвалялася “рукапалагаць толькі дасягнуўшых” 25 гадоў, ў сан святара – не маладзейшых за 30 гадоў. Для аўдавелых і халастых цэнз павялічваўся да 40 гадоў [8, №46974].

Але па распараджэнню Св. Сінода ў епархіях Беларусі дазвалялася рукапалагаць на пасаду святара і скончыўшых семінарскі курс выхаванцаў 25-гадовага ўзросту “па выключнай неабходнасці”. Далей ўдакладнялася, што ўзрост дыякана складаў не менш 21год, а святара – 24 года [2, арк.13-15].

Ў другой палове XIXст. адбываюцца значныя змены ў сацыяльным становішчы духавенства, асабліва прыхадскога. Галоўнай мэтай якіх было фарміраванне новага тыпу добраадукаванага, вопытнага, дынамічнага святара. Ліквідацыя саслоўнай замкнёнасці духавенства садзейнічала павелічэнню яго сацыяльнай мабільнасці. У канцы 90-х гг. XIXст. у духоўных семінарыях Беларусі большасць навучэнцаў былі іншасаслоўныя.

1.Могилёвские епархиальные ведомости за 1897г.- Могилёв - на Днепре, 1897.

2.Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ).-Ф. 136.- Воп.1.- Спр.32950.

3.Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897г.- СПб.1903- 1905.-Вып.IV: Виленская губерния. - Тетрадь 3.- Табл. XXI, XXII.- СПб., 1903.

4.Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897г.- СПб.1903 - 1905.-Вып.V: Витебская губерния. - Тетрадь 3.- абл. XXI, XXII.- СПб., 1904.

5.Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897г.- СПб.1903 - 1905.-Вып. XI: Гродненская губерния. - Тетрадь 3.- Табл. XXI, XXII.- СПб., 1903.

6.Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897г.- СПб.1903- 1905.-Вып. XII: Минская губерния. - Табл. XXI, XXII.- СПб., 1903.

7.Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897г.- СПб.1903- 1905.-Вып. XIII: Могилёвская губерния. - Табл. XXI, XXII.- СПб., 1903.

8.Полное собрание законов российской империи повелением государя Николая Павловича составленное: Собр.II.-е.: С 12 декабря 1825г.- Спб.: тип. отд. собств.его императорского величества, 1830.-973с

9.Православное обозрение./ Под. ред. Г. Смирнова-Платонова, А. Иванцова-Платонова, П. Преображенского. - М., 1869.

10.Сборник законов о монашествующем духовенстве./Сост. А. Проволович – М., 1897.

11.Свод законов российской империи. Законы о состояниях. Т. 9.Раздел II. О духовенстве. Гл. I. Общие постановления. – Спб., 1899.

12.Статистические таблицы Российской империи, издаваемые по распоряжению МВД, ЦСК. Вып.2. Наличное население Российской империи за 1858г./ Ред. ЦСК А. Бушен - 1863.-330с.-С.268.